В. І. Караткевіч, В. Г. Кастрыцкая

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# СУСВЕТ ТЭКСТ

10–11
класы

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі,
якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй
адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання
і выхавання

В. І. Караткевіч, В. Г. Кастрыцкая

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# СУСВЕТ ТЭКСТ

## 10–11 класы

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

**Дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання**

*Рэкамендавана навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Вучэбнае электроннае выданне

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2023

УДК 373.5.016:811.161.3’42
ББК 74.268.1Беи

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры *І. М. Мішчанчук*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст», намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Маларыцкая раённая гімназія» *М. І. Навумчык*

Дадзены дапаможнік уваходзіць у вучэбна-метадычны комплекс па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці «Сусвет Тэкст», 10–11 класы

Вучэбна-метадычны комплекс факультатыўных заняткаў распрацаваны ў Нацыянальным інстытуце адукацыі ў межах выканання задання ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» і ўключаны ў зводны план выпуску (укаранення) зноў асвоенай прадукцыі (інавацый) па ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» на 2021–2025 гг., зацверджаны Міністэрствам адукацыі ад 17.02.2021. Мова выдання — беларуская.

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Камп’ютарная вёрстка *Я. І. Архіпавай*

Падпісана да карыстання 2023
Размешчана на сайце 2023

Аб’ем выдання 1364 КБ
Сістэмныя патрабаванні: ПЗ для прагляду дакументаў у фармаце pdf, ПЗ для чытання QR-кодаў

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ISBN 978-985-893-539-9

© Караткевіч В. І., Кастрыцкая В. Г., 2023
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

# Змест

*Уводзіны* ... 5

## 10 клас

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ПРАЕКТАЎ (X КЛАС) ... 16

Модуль 1. Праектная дзейнасць: як і што трэба рабіць ... 16
Модуль 2. Вучымся пісаць мастацкія творы ... 19

## 11 клас

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ПРАЕКТАЎ (XI КЛАС) ... 24

Модуль 3. Фестываль сацыяльнай рэкламы ... 24
Модуль 4. Прэзентацыя альбома дзелавых папер ... 28

*Спіс выкарыстанай літаратуры* ... 33

# Уводзіны

Адной з асаблівасцей развіцця сістэмы адукацыі на сучасным этапе з'яўляецца шырокае выкарыстанне элементаў праектнай дзейнасці, што мае на мэце не толькі сістэматызаваць веды вучняў, але і падрыхтаваць іх да дарослага жыцця, атрымання прафесіі. У працэсе падрыхтоўкі праектаў вучні маюць магчымасць прадэманстраваць свае метапрадметныя ўменні і асобасныя якасці.

Факультатыўныя заняткі «Сусвет Тэкст» арыентаваны на фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў праз рэалізацыю шэрагу праектаў. Вядучай галіной функцыянальнай адукаванасці пры гэтым з'яўляецца праца з тэкстам. Разам з тым, фарміруюцца наступныя віды функцыянальнай адукаванасці: чытацкая, фінансавая і мастацка-эстэтычная адукаванасці, камунікацыя на дзяржаўных мовах, работа з інфармацыяй, адукаванасць у сацыяльна-грамадзянскай галіне, галіне «Маральнасць».

Асноўныя вынікі па відах функцыянальнай адукаванасці прадстаўлены ў табл. 1.

*Табліца 1*

**Асноўныя вынікі па відах функцыянальнай адукаванасці**

| Віды функцыянальнай адукаванасці | Асноўныя вынікі |
|---|---|
| Праца з тэкстам | Уменне ўзаемадзейнічаць з неадаптаванымі тэкстамі ва ўмовах сучаснай сацыяльнай камунікацыі з яе ўнікальнымі ўласцівасцямі (кантэкстуальнасць, гіпертэкстуальнасць, метатэкстуальнасць, інтэртэкстуальнасць);<br>валоданне навыкамі чытання і пісьма для атрымання інфармацыі;<br>засваенне ведаў, звязаных з тэкстам (тэкст, кантэкст, мэта, тыпы апоседу, кампазіцыі і інш.),<br>метадаў аргументацыі; правіл складання дзелавых папер;<br>уменне распазнаваць сэнсавую напоўненасць тэкстаў, інтэрпрэтаваць сэнсы, зыходзячы з розных пунктаў гледжання;<br>ствараць тэксты ад розных асоб;<br>прагназаваць уздзеянне тэксту;<br>ацэньваць ступень актуальнасці ўласных тэкстаў;<br>чытаць і разумець розныя тыпы тэкстаў;<br>узбагачэнне духоўнага свету асобы;<br>рэфлексіўнасць |
| Чытацкая адукаванасць | Сфарміраваныя ўменні і навыкі прадуктыўнага чытання |
| Фінансавая адукаванасць | Уменне планаваць фінансы, час і іншыя рэсурсы; дзелавая актыўнасць і ўважлівасць |

| Віды функцыянальнай адукаванасці | Асноўныя вынікі |
|---|---|
| Мастацка-эстэтычная адукаванасць | Сфарміраваны эмацыянальны інтэлект;<br>уменне адчуваць, бачыць і разумець прыгожае, атрымліваць ад яго асалоду; ацэньваць артэфакты мастацкай культуры;<br>уменне ствараць новыя пазітыўныя перажыванні;<br>уменне разумець мастацкую ўмоўнасць і пераносіць яе на рэальнае жыццё |
| Камунікацыя на дзяржаўных мовах | Гатоўнасць вучняў да ажыццяўлення вербальных і невербальных зносін на дзяржаўных мовах з улікам моўных і маўленчых норм |
| Работа з інфармацыяй | Гатоўнасць вучняў да пошуку новых ведаў як асновы пераўтварэння свету ў адпаведнасці з сацыяльнымі патрэбамі і інтарэсамі; уменне вучыцца з выкарыстаннем розных (у т. л. лічбавых) тэхналогій; цікаўнасць і імкненне пастаянна развівацца і ўдасканальвацца; крытычнасць |
| Адукаванасць у сацыяльна-грамадзянскай галіне | Гатоўнасць вучняў да канструктыўных і стваральных дзеянняў, скіраваных на памнажэнне дабрабыту краіны, яе абарону, падтрымку яе эканамічнай і сацыяльнай стабільнасці; уменне рацыянальна выкарыстоўваць рэсурсы; самастойнасць падчас прыняцця рашэнняў |
| Галіна «Маральнасць» | Уменне аналізаваць уласныя дзеянні і ўчынкі, а таксама дзеянні і ўчынкі іншых з пазіцыі адпаведнасці агульначалавечым каштоўнасцям; імкненне да самаразвіцця |

Пры рэалізацыі вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Сусвет Тэкст» фарміруюцца наступныя *ўніверсальныя каштоўнасці*:

- **духоўныя:** творчасць, прыгажосць, пазнанне, інтэлект, развіццё, памяць, мараль, шчасце, сяброўства;
- **матэрыяльныя:** навакольнае асяроддзе, матэрыяльная культура, якасць жыцця;
- **сацыяльныя:** ідэал, справядлівасць, воля, мір, павага, узаемаразуменне, імпатыя, прафесійны выбар, праца.

Факультатыўныя заняткі прызначаны для вучняў трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі (X і XI класы) і разлічаны на 69 гадзін (35 гадзін на год у X класе, 34 — у XI класе).

*Актуальнасць* падобнага роду факультатыўных заняткаў абумоўлена істотнымі зменамі ў эканамічным, палітычным, грамадскім і культурным жыцці, якія назіраюцца апошнія дзесяцігоддзі, дыктуюць неабходнасць павышэння патрабаванняў да выпускніка ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (агульны культурны ўзровень, гатоўнасць да асваення прафесіі, да атрымання адукацыі на працягу ўсяго жыцця і інш.). У інфармацыйным грамадстве адукацыйны працэс павінен вырашаць адну з найважнейшых праблем, якая нараджаецца супярэчнасцю паміж бясконцым ростам інфармацыйных плыняў і магчымасцю чалавека атрымліваць і перапрацоўваць разнастайную інфармацыю праз рознага роду тэксты.

У жыцці звычайнага чалавека ўсё большую ролю адыгрываюць так званыя крэалізаваныя тэксты (складаюцца з вербальнага тэксту і ілюстрацыйных элементаў), у структураванні якіх разам з вербальнымі прымяняюцца іканічныя сродкі (піктаграмы, ідэаграмы і інш.), а таксама сродкі іншых семіятычных кодаў (шрыфт, колер, размяшчэнне і інш.). Адзначым, што асобая ўвага да вывучэння крэалізаваных тэкстаў выклікана тым фактам, што пры іх інтэрпрэтацыі ўзнікаюць цяжкасці ў значнай колькасці не толькі вучняў, але і дарослых.

Зыходзячы з адзначанага вышэй, *мэта* названых факультатыўных заняткаў — фарміраванне ў вучняў універсальных складнікаў функцыянальнай адукаванасці, скіраваных на навучанне асэнсаванаму чытанню рознага роду тыпаў тэкстаў.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя *задачы:*

- ✓ развіваць навыкі працы з інфармацыяй, якая ўтрымліваецца ў рознага роду тэкстах (мастацкіх, навукова-папулярных, афіцыйна-дзелавых і інш.) праз акумуліраванне ведаў, пры вывучэнні вучэбных прадметаў гуманітарнай адукацыі;
- ✓ падтрымліваць цікавасць да чытання, фарміраваць патрэбу вучняў у сістэматычным чытанні і спасціжэнні рознага роду тэкстаў;
- ✓ забяспечыць асэнсаванне тэкстаў у кантэксце розных гістарычных эпох, розных камунікатыўных сітуацый і інш.;
- ✓ фарміраваць уменні пісьмовага выражэння думак, пачуццяў, эмоцый і г. д.;
- ✓ развіваць здольнасці вучняў свабодна выкарыстоўваць навыкі чытання тэкстаў (у т. л. крэалізаваных) для атрымання неабходнай інфармацыі;
- ✓ развіваць адчуванне мовы, стылёвай звязнасці тэксту;
- ✓ фарміраваць у вучняў уменні, звязаныя са стварэннем уласных тэкстаў (у т. л. крэалізаваных) у адпаведнасці з камунікатыўнай сітуацыяй;
- ✓ садзейнічаць самаразвіццю асобы ў працэсе развіцця навыкаў асэнсаванага чытання і асэнсавання рознага роду тэкстаў.

Засваенне гэтай праграмы дапаможа вучням фармуляваць і дасягаць прафесійных і жыццёвых мэт, аператыўна рэагаваць на розныя жыццёвыя сітуацыі, у т. л. у прафесійнай сферы.

Прыкладны тэматычны план факультатыўных заняткаў прадстаўлены ў табл. 2.

*Табліца 2*

**Прыкладны тэматычны план факультатыўных заняткаў**

| № модуля, тэмы | Назва модуля, тэмы | Колькасць гадзін | Віды дзейнасці |
|---|---|---|---|
| **X клас** | | | |
| **МОДУЛЬ 1. Праектная дзейнасць: як і што трэба рабіць** | | | |
| 1 | Фармуляванне мэты, задач праекта | 1 | Гутарка, выкананне заданняў, дыскусія |
| 2 | Пошук крыніц інфармацыі | 1 | Праца з рознымі крыніцамі інфармацыі, выкананне заданняў |

| № модуля, тэмы | Назва модуля, тэмы | Колькасць гадзін | Віды дзейнасці |
|---|---|---|---|
| 3 | Веды, уменні і навыкі, рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі праекта або правядзення даследавання | 1 | Дзелавая гульня, выкананне заданняў, абмеркаванне |
| 4 | Планаванне праектнай дзейнасці | 2 | Гутарка, праца з рознымі крыніцамі інфармацыі, дыскусія |
| **МОДУЛЬ 2. Вучымся пісаць мастацкія творы** | | | |
| 1 | Якой павінна быць сучасная мастацкая літаратура? | 5 | Анкетаванне розных груп рэспандэнтаў, інтэрв'ю, праца з літаратурай, інфармацыйнымі крыніцамі, напісанне эсэ. Прэзентацыя праекта |
| 2 | Збор інфармацыі для стварэння мастацкага твора | 2 | Праца з рознымі крыніцамі; сістэматызацыя атрыманых звестак; выкананне заданняў |
| 3 | Адзінства формы і зместу | 2 | Выкананне заданняў, выступленне з паведамленнямі, дыскусія |
| 4 | Слова. Вобраз. Тэма | 2 | Праца з мастацкімі і/або публіцыстычнымі тэкстамі; выкананне заданняў; абмеркаванне прачытанага |
| 5 | Анатацыя як форма прэзентацыі мастацкага твора | 1 | Аналіз мастацкага твора, выкананне заданняў, падрыхтоўка анатацыі для рознай чытацкай аўдыторыі |
| 6 | Як не стаць графаманам? | 1 | Выкананне заданняў, круглы стол, дыскусія |
| 7.1 | Ад натхнення да твора (творчы практыкум): эпічныя творы | 4 | Збор інфармацыі для напісання твора, падрыхтоўка паведамленняў; напісанне эпічнага твора, абмеркаванне напісанага |
| 7.2 | Ад натхнення да твора (творчы практыкум): лірычныя творы | 4 | Выкананне заданняў, збор інфармацыі для напісання твора, падрыхтоўка паведамленняў; напісанне лірычнага твора, абмеркаванне напісанага |
| 7.3 | Ад натхнення да твора (творчы практыкум): драматургічныя творы | 2 | Збор інфармацыі для напісання твора, падрыхтоўка паведамленняў, напісанне драматургічнага твора, абмеркаванне напісанага |

| № модуля, тэмы | Назва модуля, тэмы | Колькасць гадзін | Віды дзейнасці |
|---|---|---|---|
| 8 | Літаратурная крытыка | 2 | Аналіз прачытанага мастацкага твора, падрыхтоўка і прэзентацыя праекта |
| 9 | Афармленне зборніка мастацкіх твораў | 2 | Экскурсія ў выдавецтва (па магчымасці) / сустрэча з супрацоўнікам выдавецтва або часопіса, літаратурным рэдактарам, карэктарам і інш.; напісанне ўступнага артыкула і каментарыяў, падбор ілюстрацый; падрыхтоўка зборніка да прэзентацыі |
| 10 | Прэзентацыя зборніка мастацкіх твораў | 3 | Падрыхтоўка і правядзенне прэс-канферэнцыі, падвядзенне вынікаў працы за год |
| УСЯГО Ў X КЛАСЕ | | 35 | |
| **XI клас** | | | |
| **МОДУЛЬ 3. Публічныя тэксты** | | | |
| 1 | Крэалізаваныя тэксты і іх інтэрпрэтацыя | 3 | Падрыхтоўка паведамленняў, выкананне заданняў, стварэнне крэалізаваных тэкстаў |
| 2 | Рэкламны тэкст | 3 | Падрыхтоўка паведамленняў, выкананне практыкаванняў, дзелавая гульня |
| 3.1 | Фестываль сацыяльнай рэкламы: падрыхтоўчы этап | 2 | Складанне праграмы, сцэнарыяў, падрыхтоўка тэкстаў |
| 3.2 | Фестываль сацыяльнай рэкламы: фінальны этап | 9 | Правядзенне фестывалю, вызначэнне пераможцаў, падвядзенне вынікаў |
| **МОДУЛЬ 4. Дзелавыя тэксты** | | | |
| 1 | Дзелавыя тэксты: мэта, структура, прызначэнне | 1 | Дыскусія, выкананне практыкаванняў, падрыхтоўка паведамленняў |
| 2 | Аб'явы | 1 | Знаёмства з асаблівасцямі аб'явы, выкананне практыкаванняў |
| 3 | Пісьмы ў дзелавой сферы (запрашэнне, заказ, прэтэнзія, скарга і іншыя) | 3 | Знаёмства з шаблонамі пісьмаў, абмеркаванне розных падыходаў да напісання пісьмаў; складанне памяткі; стварэнне ўласных узораў пісьмаў |

*Заканчэнне табл. 2*

| № модуля, тэмы | Назва модуля, тэмы | Колькасць гадзін | Віды дзейнасці |
|---|---|---|---|
| 4 | Аўтабіяграфія | 1 | Дзелавая гульня «Хто я?», падрыхтоўка самапрэзентацыі, знаёмства з біяграфіямі вядомых асоб, напісанне аўтабіяграфіі |
| 5 | Характарыстыка | 2 | Збор інфармацыі для характарыстыкі, выкананне заданняў, падрыхтоўка характарыстыкі |
| 6 | Рэзюмэ | 1 | Падрыхтоўка інфармацыі для напісання рэзюмэ, выкананне практыкаванняў, напісанне рэзюмэ |
| 7 | Распіска | 1 | Выкананне практыкаванняў, дзелавая гульня, падрыхтоўка паведамленняў, напісанне распіскі |
| 8 | Перагаворы | 4 | Складанне сцэнарыя перагавораў, трэнінгі, маўленчыя практыкаванні, дзелавая гульня «Перагаворы» |
| 9 | Прэзентацыя альбома дзелавых тэкстаў | 3 | Арганізацыя прэзентацыі альбома дзелавых папер, складанне сцэнарыя прэзентацыі, падвядзенне вынікаў працы за год |
| УСЯГО Ў XI КЛАСЕ | | 34 | |

Прадуктамі рэалізацыі праектнай дзейнасці ў межах рэалізацыі праграмы факультатыўных заняткаў «Сусвет Тэкст» будуць зборнік мастацкіх твораў, альбомы тэкстаў для розных жыццёвых сітуацый, наборы паштовак, даведнікі па стварэнні тэкстаў, рэкламныя тэксты і інш.

У межах працы на факультатыўных занятках «Сусвет Тэкст» неабходны зварот да ведаў, атрыманых на вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура», «Руская мова», «Руская літаратура», «Мастацтва (сусветная і айчынная мастацкая культура)», «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя», «Геаграфія», «Інфарматыка».

Для паспяховай рэалізацыі асноўных задач факультатыўных заняткаў неабходна мець камп’ютарную тэхніку (камп’ютар з доступам да інтэрнэту, прынтар, сканер), доступ да бібліятэчных фондаў, паперу, каляровыя маркеры, алоўкі.

### Крытэрыі ацэньвання ходу і вынікаў ажыццяўлення праектнай дзейнасці: агульныя падыходы

Праектная дзейнасць вучняў, як і іншая вучэбная дзейнасць, павінна атрымаць ацэнку. Кожны настаўнік мае права сам выпрацаваць сваю методыку ацэньвання вынікаў дзейнасці на факультатыўных занятках, улічваючы іх спецыфіку. Важна памятаць, што для рэалізацыі праектнай дзейнасці важна стварыць праблемную сітуацыю, якая не мае відавочнага спосабу вырашэння. У гэтай сітуацыі вучань вымушаны:

- прааналізаваць сітуацыю;
- выявіць супярэчнасці, праблемы, якія патрабуюць вырашэння;
- выбраць рацыянальны шлях вырашэння праблемы;
- прадумаць, якія рэсурсы неабходныя для вырашэння праблемы, правесці інвентарызацыю тых, што ёсць; вылічыць, дзе ўзяць тыя, якіх не хапае;
- атрымаць пэўны прадукт і прэзентаваць яго.

Пры ацэнцы вынікаў гэтай дзейнасці важна ўлічваць наступныя аспекты.

1. У аснове ацэначнай дзейнасці павінна быць фарміруючае ацэньванне (актыўная ацэнка), якое ажыццяўляецца ў працэсе вучэбнай дзейнасці і скіравана на аналіз прадметных, метапрадметных і асобасных вынікаў. Вынікі дзейнасці канкрэтнага вучня павінны параўноўвацца з яго папярэднімі вынікамі. Праз гэта адбываецца матывацыя вучня да новых дасягненняў. Настаўнік не павінен выстаўляць адзнакі, а мусіць матываваць вучня да самааналізу. Кіраваць яго індывідуальнай адукацыйнай траекторыяй. Гэты від ацэньвання найбольш падыходзіць да асобасных вынікаў. Больш падрабязна пра фарміруючае ацэньванне тут (малюнкі 1, 2).

Мал. 1.
QR-код
Актыўная ацэнка ў дзеянні : вопыт настаўнікаў Беларусі : дапаможнік для настаўнікаў / М. І. Запрудскі, М. В. Кудзейка, Т. П. Мацкевіч і інш.; пад рэд. М. І. Запрудскага. — Мінск, 2014. — 238 с.

Мал. 2.
QR-код
Активная оценка в образовательном процессе школы / отв. редактор М. А. Ушаков. — М. : Сентябрь, 2018. — 168 с.

2. Для ацэнкі метапрадметных вынікаў можна прымяняць крытэрыяльную ацэнку. Найважнейшай умовай яе эфектыўнасці з’яўляецца адкрытасць (можна дапаўняць і змяняць крытэрыі). Крытэрыі павінны аб’яўляцца да пачатку рэалізацыі праекта, што забяспечвае аб’ектыўнасць і непрадузятасць, захаванне роўных умоў для усіх.
3. Выкарыстанне інтэгральнага і аналітычнага падыходаў пры фарміраванні крытэрыяў ацэнкі ў залежнасці ад мэты ацэнкі і ступені падрыхтаванасці вучняў.

Інтэгральны падыход да ацэньвання вынікаў праектнай дзейнасці прадугледжвае комплексны аналіз усіх элементаў праекта (падрыхтоўчая дакументацыя, атрыманы прадукт, прэзентацыя праекта і інш.). Пры гэтым важна выявіць ступень самастойнасці пры рэалізацыі асобных этапаў праектнай дзейнасці (поўнасцю самастойна / пры дапамозе настаўніка ці іншых асоб / не можа выканаць нават пры дапамозе).

Пры выкарыстанні аналітычнага падыходу выяўляюцца і фіксуюцца ўзроўні сфарміраванасці кампетэнцый на колькаснай аснове.

Для ацэньвання можна выкарыстоўваць табліцы крытэрыяў, у якіх будуць вызначаны важныя паказчыкі крытэрыяў (расшыфроўкі крытэрыя) і індыкатары (колькаснае або якаснае апісанне магчымых значэнняў паказчыка). Узор табліцы крытэрыяў пададзены ў табл. 3.

*Табліца 3*

**Крытэрыі ацэньвання**

| Крытэрый | Паказчык | Індыкатары | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Рэалізаваны поўнасцю | У большай ступені рэалізаваны | Рэалізаваны часткова | Не рэалізаваны |
| Фармулёўка мэты, задач | Мэта адпавядае тэме праекта | | | | |
| | Задачы адпавядаюць мэце | | | | |
| | Задачы дазваляюць дасягнуць мэты | | | | |
| <…> | | | | | |
| Якасць правядзення прэзентацыі | Прэзентацыя праведзена своечасова і адпавядае зададзенаму сцэнарыю | | | | |
| | Прэзентацыя выклікае зацікаўленасць удзельнікаў | | | | |

Для нагляднасці і большай аб’ектыўнасці ацэнкі можна ўвесці колькасныя паказчыкі кожнага з індыкатараў. Напрыклад, рэалізаваны поўнасцю — 4, рэалізаваны ў большай ступені — 3, рэалізаваны часткова — 2, не рэалізаваны — 1.

Сярод крытэрыяў ацэнкі праектаў могуць быць наступныя: фармулёўка мэты і задач; пастаноўка і абгрунтаванне праблемы; разнастайнасць крыніц, якія выкарыстаны пры выкананні праекта; рацыянальнасць выкарыстаных спосабаў дасягнення мэты і вырашэння задач; глыбіня раскрыцця праблемы; асабістая зацікаўленасць аўтара(аў) пры рэалізацыі праекта; адпаведнасць афармлення праекта зададзеным характарыстыкам; якасць правядзення прэзентацыі; запатрабаванасць праектнага прадукту. Гэты пералік мае прыкладны характар, ён можа быць пашыраны або звужаны ў залежнасці ад канкрэтнага праекта.

Сама фармулёўка крытэрыяў арыентуе вучня, на што трэба звярнуць увагу ў першую чаргу, што з'яўляецца другасным.

Немалаважнай з'яўляецца ацэнка не толькі настаўніка, але і самаацэнка ўдзельнікаў праекта. Вучні таксама могуць прыняць удзел у ацэначнай працэдуры. Пры дастатковай сфарміраванасці крытычнасці можна прапанаваць вучням самім прыняць удзел у фарміраванні крытэрыяў, паказчыкаў і індыкатараў ацэнкі праектнай дзейнасці. Настаўнік павінен скіроўваць увагу на тое, што паказчыкі павінны быць вымяральнымі і прымяняльнымі ў адносінах да канкрэтнага праектнага прадукту.

### Агульныя патрабаванні да праектнай дзейнасці

Праектная дзейнасць вылучаецца шматфункцыянальнай скіраванасцю і магчымасцю выбудоўваць індывідуальную траекторыю развіцця вучня. Яна дастаткова эфектыўная для вырашэння названай задачы. Для рэалізацыі праектнай дзейнасці неабходна ўлічваць некаторыя ўмовы: уменне вучняў працаваць у групе, дастаткова развітыя навыкі камунікацыі, пастаноўку даследчай мэты. Паспяховы праект ад самага пачатку стварэння павінен адпавядаць пэўным параметрам:

- арыентацыя на стварэнне чагосьці новага (выяўленне найбольш эфектыўных, прымальных новых рашэнняў або вядомых ідэй, якія прымяняюцца ў новых умовах);
- практыкаарыентаванасць (вучні павінны не проста вырашаць новую задачу, яе вырашэнне павінна мець непасрэдныя адносіны да іх жыцця, жыццёвых прыярытэтаў);
- уключэнне навуковага кампанента (пошукавы, творчы і інш.), які вызначае агульную скіраванасць і вынік работы.

Этапы праектнай дзейнасці схематычна прадстаўлены ў абагульненым выглядзе ў табл. 4.

*Табліца 4*

**Этапы праектнай дзейнасці**

| Этап праектнай дзейнасці | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучня |
|---|---|---|
| I. Уваход у праблему праекта | • Фармулёўка праблемнай сітуацыі;<br>• фармулёўка сюжэтнай сітуацыі;<br>• удакладненне праблемы праекта, мэты, задач (пры неабходнасці);<br>• матывацыйныя ўстаноўкі | • Фарміраванне каманды;<br>• фармулёўка праблемы праекта, мэты і задач;<br>• вызначэнне перспектыў развіцця праекта, неабходных рэсурсаў;<br>• засваенне ўсімі ўдзельнікамі каманды канчатковай мэты рэалізацыі праекта;<br>• вызначэнне лідара праекта |
| II. Арганізацыя дзейнасці па рэалізацыі праекта | • Удакладненне каляндарнага плана (пры неабходнасці);<br>• карэкціроўка размеркавання выканаўцаў і адказных (пры неабходнасці);<br>• кансультацыйная падтрымка вучняў | • Стварэнне каляндарнага плана ў адпаведнасці з задачамі праекта;<br>• прызначэнне выканаўцаў і адказных за вырашэнне канкрэтных задач у адпаведнасці з індывідуальнымі магчымасцямі і чаканнямі ад праекта;<br>• выбар формы і спосабаў прэзентацыі канчатковага прадукту;<br>• збор першаснай інфармацыі |

| Этап праектнай дзейнасці | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучня |
|---|---|---|
| III. Ажыццяўленне дзейнасці | • Кансультацыйная падтрымка вучняў;<br>• дапамога ў назапашванні матэрыялаў, тлумачэнне тэарэтычных паняццяў | • Пошук, збор і сістэматызацыя інфармацыі;<br>• праца з экспертамі;<br>• назапашванне матэрыялаў для прэзентацыі<br>• падрыхтоўка прэзентацыі вынікаў дзейнасці |
| IV. Прэзентацыя вынікаў дзейнасці | • Абагульненне і падвядзенне вынікаў дзейнасці;<br>• ацэньванне выканання праекта | • Прэзентацыя вынікаў дзейнасці;<br>• самааналіз і ацэнка вынікаў дзейнасці |

Прапанаваная схема арганізацыі праектнай дзейнасці не выключае магчымасці яе карэкціроўкі ў залежнасці ад спецыфікі праектнай дзейнасці, ступені падрыхтаванасці да самастойнай работы вучняў.

З пункту погляду вучня праект — гэта магчымасць зрабіць самастойна ці ў групе тое, што цікавіць. У праектнай дзейнасці можна паспрабаваць сябе ў розных ролях, выкарыстаць свае здольнасці ў нестандартнай сітуацыі і атрымаць канкрэтны прадукт. Гэты прадукт можа быць выкарыстаны як самім вучнем, так і іншымі.

У працэсе выканання праекта паглыбляюцца веды ў пэўнай галіне, пашыраецца разуменне пэўных з’яў і працэсаў.

Для настаўніка вучэбны праект — гэта дыдактычны сродак, які дае магчымасць фарміравання асобасных і метапрадметных кампетэнцый у межах той праблемы, якая вырашаецца ў праекце.

Праект дае магчымасць развіваць наступныя ўменні:
- аналізаваць сітуацыю;
- шукаць і адбіраць неабходную інфармацыю;
- мадэляваць сітуацыі;
- разглядаць розныя шляхі вырашэння жыццёвых праблем;
- наладжваць камунікацыю ў групе (калектыве);
- праводзіць сацыялагічныя даследаванні.

Важна разумець, што большай часткай па вялікім рахунку настаўнік пры выкананні праектаў з’яўляецца мудрым дарадцам, незаўважным праваднікам, які накіроўвае працу вучняў у патрэбнае рэчышча. Пры гэтым ўмяшальніцтва павінна быць мінімальным.

Факультатыўныя заняткі «Сусвет Тэкст» арыентаваны на здзяйсненне прыкладны́х праектаў; атрыманыя ў выніку прадукты будуць выкарыстоўвацца вучнямі ў далейшым.

Для арганізацыі праектнай дзейнасці ва ўстанове адукацыі карысна ствараць банк даных вучэбных праектаў на аснове інфармацыйных карт, пазіцыі якіх ўключаюць у сябе назву праекта, аўтара(-аў), клас, кіраўніка, працягласць выканання, атрыманы прадукт (спасылку, дзе з ім можна пазнаёміцца), ацэнку праекта.

Увесь выкарыстаны ілюстрацыйны матэрыял (фотаздымкі, выявы, інш.) у гэтым дапаможніку, акрамя QR-кодаў, узяты з адкрытых крыніц сеткі Інтэрнэт.

# 10 клас

# Метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы праектаў (X клас)

## Модуль 1. Праектная дзейнасць: як і што трэба рабіць

Галоўная мэта гэтага модуля навучыць:

- фармуляваць мэту, задачы;
- самастойна знаходзіць крыніцы інфармацыі, ацэньваць іх з пункту погляду праўдзівасці і неабходнасці для дасягнення мэты;
- карэктна афармляць спіс крыніц інфармацыі;
- вызначаць неабходныя веды, уменні і навыкі, а таксама рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі праекта;
- планаваць праектную дзейнасць.

Падрыхтоўчая работа можа разглядацца таксама як своеасаблівы праект, які мае ў выніку свой прадукт.

На першых занятках неабходна стварыць атмасферу даверу і разумення важнасці для сябе і іншых выканання праектаў. Праз стварэнне праблемнай сітуацыі (зварот да вопыту вучняў, асабістага вопыту настаўніка), знаёмства з прыкладным тэматычным планам факультатыўных заняткаў варта прыцягнуць увагу да асноўных вынікаў. Таксама пажадана пазнаёміць са структурай дапаможніка для вучняў: умоўнымі абазначэннямі, пазатэкставай інфармацыяй, да якой можна звярнуцца праз QR-коды, плануемымі вынікамі дзейнасці, матывуючымі эпіграфамі, структурай заданняў.

Заданні 1, 2 скіраваны на выпрацоўку ўменняў пастаноўкі мэты і фармулёўкі задач. Важна звярнуць увагу, што мэта выцякае з дамінуючай праблемы. Папярэдне неабходна патлумачыць паняцце «маніпуляцыя».

Магчымыя варыянты фармулёўкі мэты, звязанай з аналізам фрагмента твора У. Шэкспіра (можна выкарыстаць фрагмент іншага мастацкага твора):

- выявіць ступень свабоды дзеянняў і ўчынкаў Гамлета ў адносінах да абставін;
- разгледзець розныя формы маніпулятыўных дзеянняў у трагедыі «Гамлет»;
- вызначыць маркеры маніпулятыўных выказванняў і магчымыя рэакцыі на іх.

Фармулюючы задачы для напісання сцэнарыя фільма, пры выкананні задання 2 неабходна скіраваць увагу вучняў на неабходнасць звароту да розных крыніц. Сярод іх можа быць інтэрв'ю з літаратуразнаўцамі (экспертамі), анкетаванне суседзяў.

Вывучэнне тэмы 2 «Пошук крыніц інфармацыі» пажадана пачаць са стварэння праблемнай сітуацыі: звярнуцца да пытання праўдзівасці інфармацыі, вопыту вучняў крытычна ацэньваць тое або іншае выказванне. Дарэчным будзе выкарыстанне метаду (прыёму) правакацыі. Для гэтага можна прапанаваць тэкст, у якім будуць правакацыйныя сцвярджэнні, што запускаюць механізм дыскусіі. Напрыклад, наступны тэкст пра сон.

Сон — гэта проста марнаванне часу. Чалавек губляе 7–9 гадзін свайго жыцця, лежачы на ложку з заплюшчанымі вачыма. У гэты час ён нічога не робіць. А жыццё так хутка пралятае! Вядома, што вялікая колькасць знакамітых пісьменнікаў стваралі свае геніяльныя творы ноччу. Значыць, для таго каб стаць знакамітым, трэба меней спаць, а болей займацца тым, што табе падабаецца.

Выклікаўшы вучняў на дыскусію, трэба падвесці да разумення таго, што не ўсякай інфармацыі трэба давяраць.

Далей можна звярнуцца да тэарэтычнага матэрыялу дапаможніка для вучняў і выканання заданняў 3, 4, якія замацоўваюць атрыманыя веды і навыкі працы з інфармацыяй.

Тэарэтычны матэрыял тэмы 3 вучні засвойваюць самастойна. Заняткі мэтазгодна пабудаваць у выглядзе дзелавой гульні, асновай якой можа быць калектыўнае абмеркаванне вынікаў выканання заданняў 5 і 6.

У залежнасці ад колькасці вучняў заданне 5 выконваецца або самастойна, або ў малых групах.

Заданне 6 можна прадставіць у выглядзе міні-праекта.

У залежнасці ад абставін (год юбілею вядомага пісьменніка, сувязь жыцця і творчасці пісьменніка з той мясцовасцю, дзе размешчана ўстанова адукацыі, і інш.) можна выбраць іншую асобу. У час выканання праекта-квэста настаўніку неабходна самому вызначыць групы вучняў у залежнасці ад задач: падбор твораў, вызначэнне адметных рыс тых або іншых твораў, складанне заданняў. Пэўныя групы павінны вызначыць неабходныя рэсурсы для рэалізацыі тых задач, якія перад імі стаяць.

Вынікі рэалізацыі гэтага міні-праекта могуць быць прэзентаваны ў выглядзе гульні, напрыклад, для аднакласнікаў.

Выкананне задання 6 папярэднічае вывучэнню апошняй тэмы «Планаванне праектнай дзейнасці» модуля 1.

Для паспяховага выканання праектаў вучні павінны ўмець планаваць сваю дзейнасць на розных этапах рэалізацыі праекта. Планаванне — гэта самы складаны і адказны этап, ад якога залежыць паспяховасць усёй працы над праектам. Асноўная мэта заняткаў — навучыць планаванню для дасягнення вызначанага выніку.

Заняткі неабходна пачаць з гутаркі пра значэнне планавання ўласнай дзейнасці. Потым трэба пазнаёміць вучняў з тэарэтычным матэрыялам дапаможніка.

Для паскарэння некаторых аперацый планавання пажадана выкарыстоўваць розныя схемы і ўмоўныя абазначэнні. Пералік неабходных для планавання аперацый і іх умоўных абазначэнняў можна папаўняць у залежнасці ад асацыяцый вучняў, іх зацікаўленасці і інш. (табл. 5)

*Табліца 5*

**Умоўныя абазначэнні**

| | |
|---|---|
| Трэба спытаць | ? |
| Прачытаць |  |
| Падлічыць | - I - I - |
| Атрымаць інфармацыю |  |
| Важная інфармацыя | NB |
| Трэба падумаць | ! |

Інфармацыю па планаванні невялікіх праектаў можна прэзентаваць у выглядзе схемы (малюнак 3).




Мал. 3

Што? — прадукт праектнай дзейнасці
Для каго? — для каго ствараецца прадукт
Дзе? — дзе гэты прадукт можа быць выкарыстаны
Навошта? — мэта стварэння прадукту
Хто? — выканаўцы праекта
Калі? — час выканання праекта (яго асобных этапаў)
Як? — якія спосабы стварэння прадукту
Колькі? — колькі і якія рэсурсы для гэтага спатрэбяцца

На занятках можна выкарыстоўваць мазгавы штурм для стварэння плана праекта з зададзенай настаўнікам тэмай або прадуктам праектнай дзейнасці. Тэма не павінна быць глабальнай. Яна павінна ўкладацца ў прапанаваную схему, якую можна маляваць або на дошцы, або на аркушах А3. Напрыклад, можна прапанаваць такія прадукты: серыя паштовак да юбілею пісьменніка, сайт «Падарожжа па маім горадзе (маёй вёсцы)», «Літаратурная кулінарная кніга».

Пасля гэтага трэба звярнуць увагу на праблему ацэньвання праектнай дзейнасці. Можна выкарыстаць матэрыялы, змешчаныя на с. 7–9 гэтых метадычных рэкамендацый *Крытэрыі ацэньвання ходу і вынікаў ажыццяўлення праектнай дзейнасці: агульныя падыходы*.

У выніку вучні павінны прапанаваць уласную тэму для праекта, звязанага з развіццём літаратуры і мастацтва, сфармуляваць мэту, задачы гэтага праекта, скласці каляндарны план работы. Такі пашпарт праекта суадносіцца з прапанаваным у заданні 8.

## Рэкамендуемая літаратура

*Алексеев, Н. Г.* Проектирование и рефлексивное мышление / Н. Г. Алексеев. // Развитие личности. — 2002. — № 2. — С. 85–103. [Электронный документ] — Режим доступа : http://rl-online.ru/articles/2-02/111.html. — Дата доступа : 08.09.2022.

*Гузеев, В. В.* Образовательная технология: от приема до философии / В. В. Гузеев. — М. : Изд. фирма «Сентябрь», 1996.

*Гузеев, В. В.* Планирование результатов образования и образовательная технология / В. В. Гузеев. — Москва : Народное образование, 2001.

*Даутова, О. Б.* Педагогические технологии для старшей школы в условиях цифровизации современного образования / О. Б. Даутова, О. Н. Крылова. — СПб. : КАРО, 2020.

Новые педагогические и информационные технологии в системе образования / Е. С. Полат, М. Ю. Бухаркина, М. В. Моисеева, А. В. Петров ; под ред. Е. С. Полат. — Москва : Издательский центр «Академия», 2002.

*Пахомова, Н. Ю.* Метод учебного проекта в образовательном учреждении : пособие для учителей и студентов педагогических вузов / Н. Ю. Пахомова. — Москва : АРКТИ, 2005.

Электронная энциклопедия «Кругосвет» [Электронный ресурс] — Режим доступа : krugosvet.ru. — Дата доступа : 16.09.2022.

## Модуль 2. Вучымся пісаць мастацкія творы

Праект, які будзе ажыццяўляцца ў X класе, — «Якой павінна быць сучасная мастацкая літаратура?». Пашпарт праекта прыведзены ў дапаможніку для вучняў. Пашпарт можа быць скарэкціраваны ў адпаведнасці з узроўнем падрыхтаванасці вучняў, іх зацікаўленасці. У час працы над праектам вучні набываюць навыкі збору і адбору інфармацыю, вучацца вызначаць неабходныя рэсурсы, працаваць у камандзе. Праз анкетаванне, апытванне розных катэгорый рэспандэнтаў, аналіз розных крыніц вучні «ўваходзяць» у праблему запатрабаванасці сучаснай літаратуры.

Вынікі праектнай дзейнасці могуць быць прэзентаваны на конкурсе работ даследчага характару, школьнай канферэнцыі і інш.

Другім праектам, які ажыццяўляецца ў X класе, з'яўляецца «Зборнік мастацкіх твораў».

Асноўная мэта гэтага праекта — прэзентаваць калектыўны зборнік мастацкіх твораў, напісаных вучнямі.

Задачы:

- сабраць неабходную інфармацыю пра тое, што будзе апісвацца ў будучым мастацкім творы;
- асэнсаваць адзінства і ўзаемаўплыў формы і зместу ў мастацкім творы;
- вызначыць актуальныя тэмы, спецыфіку вобразнай сістэмы, ідэю і сэнсы канкрэтнага твора;
- стварыць анатацыю да твора (зборніка твораў);
- напісаць мастацкія творы;
- стварыць літаратурна-крытычныя матэрыялы да напісаных вучнямі твораў;
- афарміць зборнік мастацкіх твораў;
- прэзентаваць свой зборнік для розных груп чытачоў.

Актуальнасць гэтага праекта заключаецца ў тым, што вучні X класа дастаткова часта маюць унутраную патрэбу праяўляць энергію думкі, але не ведаюць, куды яе скіраваць. Праз стварэнне ўласных мастацкіх твораў (нават не самых дасканалых) вучні рэалізуюць свае ўнутраныя патрэбы. Адначасова ўзбагачаюць эмацыянальны інтэлект (здольнасць «чытаць» уласныя і чужыя эмоцыі, кіраваць імі на аснове інтэлектуальных працэсаў) і духоўны інтэлект (здольнасць, з дапамогай якой адбываецца пазнанне сэнсу падзей і ўласнага жыцця, а таксама вырашаюцца праблемы сэнсу і каштоўнасцей.

Для рэалізацыі праекта неабходна наступнае абсталяванне: камп'ютар з выхадам у інтэрнэт, прынтар (пажадана каляровы), сканер.

Выніковым прадуктам праекта стане калектыўны зборнік мастацкіх твораў, напісаных вучнямі, афармлены належным чынам. Пажадана прадугледзець шырокую прэзентацыю гэтага зборніка перад рознай мэтавай аўдыторыяй (вучні, бацькі і настаўнікі).

Асаблівасці рэалізацыі праекта. У працэсе працы над праектам асноўная ўвага павінна звяртацца на чытанне і аналіз мастацкіх твораў. Падчас канкрэтных заняткаў, на якіх дэталёва разглядаюцца ўсе кампаненты мастацкага тэксту, вучні назапашваюць матэрыял, набываюць уменні, якія будуць выкарыстаны пры стварэнні зборніка мастацкіх твораў.

Канкрэтныя формы дзейнасці настаўніка і вучняў вызначаны ў Прыкладным тэматычным плане факультатыўных заняткаў.

На выкананне праекта адводзіцца 25 гадзін, улічваючы назапашванне матэрыялаў, падрыхтоўку і прэзентацыю зборніка.

Пачынаць працу трэба з абмеркавання творчасці і матывацыйнай гутаркі або дыскусіі на тэму «Творчасць — адзіны спосаб самарэалізацыі: за і супраць».

Падчас заняткаў можна выкарыстаць практыкаванні на выяўленне крэатыўнасці.

**Практыкаванне «Другое жыццё звычайных рэчаў».** За 5 хвілін прыдумайце як мага больш спосабаў выкарыстання аркуша звычайнай паперы.

Калі ёсць такая магчымасць, то настаўнік можа паказаць уласныя вырабы з паперы.

**Практыкаванне «Ацані і дапоўні ідэю».** З прапанаваных ідэй настаўнік выбірае 5 найбольш арыгінальных і прапануе іх ацаніць па наступных крытэрыях: мэтазгоднасць ажыццяўлення, карысць для іншых (наколькі шырокае кола людзей зможа выкарыстаць ідэю). Тыя ідэі, якія, на думку большасці, могуць ажыццявіцца, прапанаваць вучням развіць і дапоўніць.

Падчас назірання за выкананнем практыкаванняў можна выявіць крэатыўныя здольнасці вучняў.

Засваенне тэмы «Збор інфармацыі для стварэння мастацкага твора» можна пачаць з парад, прыведзеных у дапаможніку для вучняў. Іх эфектыўнасць правяраецца падчас выканання задання 9.

Заданне 10 рэалізуецца як індывідуальны міні-праект. Прэзентацыя можа быць праведзена ў выглядзе перадвыбарчых дэбатаў. Вынікі гэтай дзейнасці (напісанне прамовы і выступленне з ёй)[1] могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы да публічных выступленняў. Пры неабходнасці можна прапанаваць вучням замяніць твор Дж. Роўлінг на іншы, які ўжо вядомы вучням (які вывучалі па вучэбнай праграме ці чыталі самастойна).

Вывучэнне тэмы «Адзінства формы і зместу» мае на мэце асэнсаванне вучнямі адзінства і ўзаемаўплыву формы і зместу ў мастацкім творы. Перш чым знаёміцца з тэарэтычнымі звесткамі, рэкамендуецца выканаць заданне 11, якое наглядна дэманструе ўзаемазалежнасць зместу і формы.

Заданне 12 неабходна выконваць у групах па 3-4 чалавекі. Вынікі гэтай дзейнасці могуць быць прадстаўлены ў выглядзе запоўненай табліцы сюжэтных схем (табл. 6):

*Табліца 6*

**Табліца сюжэтных схем**

| № сюжэта | Схема (кароткі змест) мастацкага твора | Магчымая форма ўвасаблення (род, жанр, кампазіцыя) |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |
| 4 | | |
| 5 | | |
| 6 | | |
| 7 | | |

Гэта табліца можа стаць зыходным пунктам для стварэння ўласнага мастацкага твора з зададзеным сюжэтам і ў вызначанай форме.

---

[1] Пры падрыхтоўцы да вуснага выступлення можна выкарыстаць наступныя крыніцы:

Баева, О. А. Ораторское искусство и деловое общение / О. А. Баева. — Минск : Новое знание, 2001.

Мурына, Л. А. Рыторыка / Л. А. Мурына. — Мінск : ТАА «Аракул», 1998.

Праскаловіч, В. У. Выкажыся, каб я цябе ўбачыў! (Мастацтва вусных выказванняў) / В. У. Праскаловіч, В. В. Кушнярэвіч. — Мінск : ЛіМ, 2010.

Русецкий, В. Ф. СловоТворчество : Литература, язык, человек в современном мире / В. Ф. Русецкий. — Минск : Национальный институт образования, 2011.

Шестакова, Е. Говори красиво и уверенно. Постановка голоса и речи / Е. Шестакова. — СПб. : Питер, 2019.

Наступным крокам у творчым працэсе з'яўляецца стварэнне непаўторных вобразаў з дапамогай выяўленчых асаблівасцей мастацтва слова. Гэтаму прысвечана тэма «Слова. Вобраз. Тэма». Некаторыя правілы і заканамернасці стварэння запамінальных вобразаў прыведзены ў дапаможніку для вучняў.

Пры выкананні задання 13 важна абмеркаваць спачатку карціну Мікалоюса Канстанцінаса Чурлёніса. Карціна павінна быць абавязкова каляровай і значнага фармату (можна вывесці на экран або раздаць каляровыя рэпрадукцыі індывідуальна), каб вучні звярнулі ўвагу на дэталі карціны.

«Дзень» — першая карціна з цыкла «Суткі». Мастак выкарыстоўвае прыём адухаўлення (можна прапанаваць вучням згадаць, што абазначае гэты тэрмін). Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на рукі істоты-прыроды, якая злучаецца з небам (аблокамі) і зямлёй. Уважліва прыгледзеўшыся, можна заўважыць: аблокі адлюстроўваюць тое, што адбываецца на зямлі. Складваецца ўражанне, што істота-прырода абуджаецца ад сну і гатова працягнуць дзень.

Вучні могуць даць уласную інтэрпрэтацыю вобразам карціны. Толькі пасля абмеркавання карціны прапануецца для чытання верш Ніны Мацяш.

Вынікі выканання задання 14 мэтазгодна аформіць у выглядзе табліцы. Важна не задаваць вучням форму табліцы, яны павінны самі яе прыдумаць у адпаведнасці з умовамі задання.

У якасці самастойнай работы можна прапанаваць заданне 15.

Вынікам вывучэння тэмы «Анатацыя як форма прэзентацыі мастацкага твора» з'яўляецца ўменне напісання цікавай анатацыі ўласнага ці чужога твора. Заняткі мэтазгодна пачаць з гутаркі пра ролю рэкламы ў «прасоўванні» пэўных прадуктаў. Напрыклад, прапанаваць вучням выбраць паміж прыгожа аформленымі цукеркамі з цікавым слоганам і цукеркамі ў нияркай упакоўцы з непрыкметнай назвай. Паказаць, што змест можа быць аднолькавым, але большасць спажыўцоў пры першым знаёмстве з прадуктам выбірае знешнюю форму. Анатацыя — гэта першы пасля вокладкі элемент, на які чытач звяртае ўвагу, таму трэба вельмі ўважліва да яго ставіцца. Парады па напісанні анатацыі прыведзены ў дапаможніку для вучняў. Гэтыя парады неабходна абмеркаваць з вучнямі, вызначыць, што яны лічаць найбольш важным у анатацыі. Для замацавання тэмы прапануецца выканаць заданні 16 і 17.

Своеасаблівым прамежкавым падагульненнем атрыманых ведаў можа стаць дыскусія «Як не стаць графаманам». Для абмеркавання прапануюцца *Дзесяць прыкмет графамана* і *Дзесяць прыкмет таленавітага аўтара*, прыведзеныя ў дапаможніку для вучняў. Вынікі дыскусіі могуць быць зафіксаваны вучнямі ў пісьмовай форме (заданне 18).

Самым значным па працягласці з'яўляецца творчы практыкум «Ад натхнення да твора». У выніку вучні павінны навучыцца пісаць мастацкія творы па зададзеных параметрах. Прапанаваная ў заданні 19 серыя з 25 практыкаванняў дапаможа вучням сфарміраваць патрэбу ў штодзённай творчай дзейнасці. Не трэба патрабаваць выканання ўсёй серыі практыкаванняў, бо творчасць «не любіць» прымусу. Заняткі лепш канструяваць у свабоднай форме як абмен думкамі і з магчымасцю прэзентаваць уласную творчасць. Роля настаўніка заключаецца ў карэкціроўцы напісання твораў вучнямі і прыцягненні ўвагі да лепшых узораў.

Важную ролю ў літаратурным жыцці адыгрывае літаратурная крытыка. Таму нельга абысціся без гэтай тэмы, важна давесці вучням, якую ролю адыгрывае крытыка для фарміравання таленту канкрэтнага мастака слова і мастацтва ў цэлым.

Літаратурная крытыка вырашае наступныя задачы:

- даць ацэнку новым творам;
- разглядзець даўно напісаныя творы з пазіцыі сучаснасці;
- дапамагчы чытачу выбраць варты для чытання твор (фарміраваць чытацкі попыт);
- даць асалоду чытачу ад зносін з тэкстам крытычнага твора.

Можна пазнаёміць вучняў, напрыклад, з узорамі літаратурна-крытычных артыкулаў Лады Алейнік (зборнік «Пясочны гадзіннік» (2010)).

Для знаёмства з разнастайнымі крытычнымі працамі мэтазгодна наладзіць выставу даследаванняў С. Андраюка, В. Бечыка, У. Гніламёдава і інш. Важна давесці, што сёння літаратурная крытыка актыўна ўключаецца ў рынкавыя механізмы рэгулявання літаратурнага працэсу, у тым ліку рэкламу і прамоцыю літаратурнай прадукцыі.

Некаторыя прынцыпы напісання крытычнай рэцэнзіі пададзены ў дапаможніку для вучняў. Настаўнік можа прапанаваць прааналізаваць працы аднаго з крытыкаў з пункту погляду захавання або адыходу ад тых або іншых прынцыпаў. Па выніках вывучэння тэмы прапануецца выканаць два міні-праекты: групавы (заданне 21) і індывідуальны (заданне 22).

Афармленне зборніка мастацкіх твораў і яго прэзентацыя адбываюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі, прапанаванымі ў дапаможніку для вучняў.

Завяршыць модуль 2 неабходна самааналізам і ацэнкай вынікаў дзейнасці. Гэта робіцца з мэтай актуалізаваць вывучаны матэрыял, ацаніць атрыманы вопыт (як пазітыўны ці негатыўны), асэнсаваць магчымасць яго прымянення ў жыцці.

Рэфлексія можа адбывацца праз пытанні для абмеркавання:

- Што засталося няздзейсненым?
- Калі б я вярнуўся ў верасень мінулага года, што б зрабіў інакш?

## Спіс літаратуры для самаадукацыі:

*Голдберг, Н.* Человек, который съел машину : Книга о том, как стать писателем / Н. Голдберг. — М. : Альпина Паблишер, 2017.

*Кожинов, В. В.* Как пишут стихи / В. В. Кожинов. — М. : Алгоритм. 2001.

*Курий, С.* Оседлать Пегаса, или Как писать стихи : пособие для начинающего поэта / С. Курий. — Ростов н/Д : Феникс, 2012.

Литературная мастерская [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://litmasters.ru/. — Дата доступа : 14.10.2022.

*Рагойша, В. П.* Літаратуразнаўчы слоўнік. Тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. — Мінск : Народная асвета, 2009.

*Шульговский, Н. Н.* Занимательное стихосложение. Научные развлечения / Н. Н. Шульговский. — М. : Изд. Дом Мещерякова, 2009.

# 11 клас

# Метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы праектаў (XI клас)

Праграма факультатыўных заняткаў для XI класа прадугледжвае рэалізацыю двух праектаў: «Фестываль сацыяльнай рэкламы» і «Прэзентацыя альбома дзелавых папер».

## Модуль 3. Фестываль сацыяльнай рэкламы

Традыцыйна перад выкананнем праекта вучні, у залежнасці ад падрыхтаванасці, самастойна або з дапамогай настаўніка запаўняюць пашпарт праекта. Нагадаем, што пашпарт праекта — дакумент, у якім адлюстравана значымая інфармацыя аб выбраным праекце — назва, мэта, задачы, праблемная сітуацыя (актуальнасць), абсталяванне, выкарыстанне канчатковага прадукту/ прызначэнне.

**Назва.** У загалоўку пашпарта праекта фармулюецца назва праекта або тэма, якая адлюстроўвае канкрэтны працэс, які будзе рэалізоўваць праект. Загаловак першага праекта: *Фестываль сацыяльнай рэкламы.*

Назва праекта можа быць іншай, напрыклад: *«Спыніся! Азірніся! Задумайся».* Аднак формай канчатковага прадукту застанецца фестываль.

**Мэта праекта:** правядзенне фестывалю сацыяльнай рэкламы для прыцягнення ўвагі насельніцтва да шэрагу актуальных праблем сучаснага грамадства.

**Задачы праекта:**

- навучыцца самастойна ствараць сацыяльную рэкламу, афішу;
- выявіць канкрэтныя праблемы грамадства, да якіх неабходна прыцягнуць увагу;
- распрацаваць постары і банеры сацыяльнай рэкламы, на якіх асвятляюцца канкрэтныя праблемы грамадства (уключаючы ідэю, слоган, мастацкае афармленне).

**Праблемная сітуацыя** (актуальнасць).

Праблемы булінгу, алкагалізму, сацыяльнай ізаляцыі, гендэрнай няроўнасці, дыскрымінацыі і інш., безумоўна, тычацца многіх людзей у грамадстве. Актуальнасць гэтай тэмы заключаецца ў тым, што сацыяльныя праблемы прама або ўскосна ўплываюць на кожнага з нас і, з пункту гледжання значнай колькасці членаў грамадства, з'яўляюцца дастаткова сур'ёзнымі і патрабуюць калектыўных намаганняў па іх пераадоленні. Менавіта таму выключна важна павышаць дасведчанасць людзей аб праблемах сацыяльнага характару і распрацоўваць сумесныя рашэнні па іх прадухіленні.

Рашэнне гэтых праблем уключае ў сябе комплекс мер, накіраваных на зніжэнне негатыўнага ўздзеяння. Адным са спосабаў рашэння, асвятлення і прыцягнення ўвагі да канкрэтнай праблемы з'яўляецца сацыяльная рэклама.

**Абсталяванне.**

Мультымедыйны праектар, камп'ютар, мікрафоны, акустычная сістэма, мальберты.

**Выкарыстанне канчатковага прадукту** (прызначэнне).

Інфармацыя будзе з'яўляцца сацыяльнай рэкламай пры наяўнасці ў сукупнасці наступных абавязковых прымет:

- аб'ектамі рэкламавання з'яўляюцца правы, інтарэсы, абавязкі, меры, з'явы (мерапрыемствы) сацыяльнага характару, накіраваныя на абарону або задавальненне грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў;
- некамерцыйны характар інфармацыі;
- рэкламадаўцам з'яўляецца дзяржаўны орган.

Сацыяльная рэклама, як і камерцыйная рэклама, можа размяшчацца (распаўсюджвацца) у любой форме з дапамогай любых сродкаў: у друкаваных і электронных сродках масавай інфармацыі (тэлебачанне, радыё), у вонкавай рэкламе і на транспартных сродках, у сетцы Інтэрнэт і г. д.

Для шырокага распаўсюджвання канчатковага прадукту да ўдзелу ў фестывалі можна (у якасці госця або члена журы) запрасіць прадстаўніка дзяржаўных органаў (міністэрстваў, ведамстваў, камітэтаў, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў), чыя дзейнасць непасрэдна звязана з грамадскімі інтарэсамі, бяспекай, здароўем, экалогіяй і г. д.

Работы пераможцаў будуць размешчаны ў друкаваных і электронных сродках масавай інфармацыі і вонкавай рэкламе.

**Асаблівасці рэалізацыі.**

На рэалізацыю праекта «Фестываль сацыяльнай рэкламы» запланавана 17 вучэбных гадзін.

Уменне ствараць крэалізаваныя тэксты з'яўляецца асновай пры падрыхтоўцы фестывалю сацыяльнай рэкламы.

Пры знаёмстве з крэалізаванымі тэкстамі неабходна сфарміраваць у вучняў разуменне таго, што крэалізацыя як працэс уяўляе сабой злучэнне двух і болей спосабаў перадачы інфармацыі, сумеснае існаванне вербальных і невербальных сродкаў, якія не існуюць асобна.

Выкананне заданняў на аналіз крэалізаваных тэкстаў дазволіць выпрацаваць уменне падбіраць трапныя сродкі, развіваць крэатыўнае мышленне, творчыя здольнасці вучняў.

Пры выбары малюнка неабходна ўлічваць, што ён павінен перадаваць пэўную інфармацыю, выказваць пачуцці адрасанта і пры гэтым прыцягваць увагу адрасата, уздзейнічаць на яго эмоцыі і эстэтычныя пачуцці.

Як і малюнак, колер тэксту выконвае пэўныя функцыі для стварэння крэалізаванага тэксту. Колер прыцягвае ўвагу, аб'ядноўвае кампаненты ў адзінае цэлае, вылучае важныя ў сэнсавым дачыненні вербальныя кампаненты, уздзейнічае на эмоцыі адрасата (чырвоны — узбуджэнне, жоўты — радасць, зялёны — спакой і г. д.), рэалізуе мастацкую задуму аўтара.

Шрыфт, як колер і малюнак, належыць да невербальных сродкаў у крэалізаваным тэксце. Функцыі шрыфту падобныя з функцыямі малюнка і колеру, аднак яны дасягаюцца за кошт іншых магчымасцей. Трэба адзначыць, што шрыфт здольны выклікаць асацыяцыі з гістарычнымі эпохамі, нацыямі, сацыяльным асяроддзем, гістарычнымі асобамі, культурнымі з'явамі. Шрыфт нясе ў сабе інфармацыю аб часе стварэння прадмета.

Для замацавання ведаў, удасканалення ўмення правільна чытаць крэалізаваныя тэксты можна прапанаваць наступнае заданне:

Разгледзьце крэалізаваныя тэксты і прааналізуйце іх.

Прыклады аналізу крэалізаваных тэкстаў:

Словазлучэнне «полы наливные» (малюнак 4) у спалучэнні з цёмным фонам сваім прасторавым афармленнем паказвае працэс у пачатку выкарыстання прадукту,

а слова «самовыравнивающиеся», набранае прамым шрыфтам, паказвае вынік прымянення прадукту (роўная падлога).



Мал. 4

На прыведзеных шыльдах (малюнкі 5, 6) праз стылізацыю кірылічнага шрыфту пад іерогліфы і шрыфты ўсходніх краін адразу ўзнікае асацыяцыя з нацыянальнай адметнасцю ўстановы.



Мал. 5



Мал. 6



Мал. 7

У словазлучэнні «Объемные Буквы» (малюнак 7) першыя літары аформлены аб'ёмна, слова «Таблички» размешчана ў рамцы, а колер выразу «Из нержавеющей стали» адпавядае колеру металу.

Выява ручнікоў (малюнак 8) карэлюе з назоўнікам «бялізна», а складзеная з іх фігура лямпачкі разам з зыходзячым ад яе белым святлом — з дзеясловам «ззяе».



Мал. 8

Праца з крэалізаванымі тэкстамі (аналіз, стварэнне) — фундамент праекта. Уменне ствараць афішы, рэкламу дапаможа атрымаць задавальненне ад стварэння канчатковага прадукту.

### Арганізацыя і правядзенне фестывалю сацыяльнай рэкламы

Правядзенне фестывалю сацыяльнай рэкламы пачынаецца з выбару аб'екта рэкламавання.

Для даведкі

Упершыню да сацыяльнай рэкламы прыбеглі грамадзянскія арганізацыі ЗША ў 1906 годзе – асацыяцыі прызывалі абараніць Ніагарскі вадаспад ад бясчынстваў электрычнымі кампаніямі. Паступова да падобных прыёмаў сталі прыбягаць не толькі дабрачынныя структуры, але і дзяржаўныя органы, бізнес.

Аб'ектам сацыяльнай рэкламы могуць быць:
- правы арганізацый або грамадзян;
- абароненыя законам інтарэсы ці абавязкі арганізацый або грамадзян;

- здаровы лад жыцця;
- меры па ахове здароўя насельніцтва;
- меры па ахове бяспекі насельніцтва;
- меры па сацыяльнай абароне;
- прафілактыка правапарушэнняў;
- ахова навакольнага асяроддзя;
- рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў;
- развіццё беларускай культуры і мастацтва;
- развіццё міжнароднага культурнага супрацоўніцтва;
- дзяржаўныя праграмы ў сферах: аховы здароўя, адукацыі, культуры, спорту;
- іншыя з’явы (мерапрыемствы) сацыяльнага характару, накіраваныя на абарону або задавальненне грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў.

Вельмі важны этап — выбар аб’екта для рэкламы. Ад гэтага выбару залежыць зацікаўленасць і заглыбленне ў тэму. Неабходна даследаваць выбраны аб’ект як мага глыбей. Для гэтага мэтазгодна прапанаваць вучням падрыхтаваць невялікае паведамленне па гэтай праблеме, вызначаючы кола праблемы, каго яна закранае, што адбудзецца, калі не звяртаць на гэта ўвагу, як можна выправіць сітуацыю пры ідэальных умовах і што па сілах зрабіць непасрэдна самаму вучню для выпраўлення дадзенай праблемы.

Пасля вызначэння аб’екта і заглыблення ў тэму пачынаецца падрыхтоўка да правядзення фестывалю ў адпаведнасці з этапамі.

Этапы падрыхтоўкі фестывалю:

- складанне плана арганізацыі і правядзення фестывалю;
- пісьмовае размеркаванне абавязкаў паміж вучнямі і прызначэнне адказных асоб за кожны этап падрыхтоўкі;
- забеспячэнне неабходнай тэхнічнай базы;
- кантроль за выкананнем распараджэнняў і рэалізацыяй пунктаў плана.

Пры падрыхтоўцы фестывалю ў першую чаргу фарміруецца арганізацыйны камітэт, у які ўваходзяць прадстаўнікі адміністрацыі (іншых устаноў і ведамстваў), настаўнікі, вучні. Арганізацыйны камітэт распрацоўвае палажэнне фестывалю.

Палажэнне — гэта дакумент, у якім рэгламентуюцца арганізацыйныя моманты фестывалю.

Палажэнне ўтрымлівае наступную інфармацыю:

- назва (тэма) фестывалю;
- мэта і парадак правядзення;
- тэрміны і ўмовы правядзення;
- колькасны і якасны склад удзельнікаў, рэпертуар ці заданне;
- крытэрыі ацэнкі вынікаў;
- склад журы;
- парадак узнагароджання пераможцаў.

Пры падрыхтоўцы фестывалю неабходна прадугледзець інфармацыйнае і прававое забеспячэнне ўдзельнікаў фестывалю (загады, распараджэнні, лісты, запрашэнні, заяўкі, маршрутныя лісты і г. д., падрыхтоўку і распаўсюджванне афіш і буклетаў фестывалю, праграмы, запрашальных білетаў, бэйджаў, дыпломаў, грамат).

Пасля завяршэння фестывалю неабходна правесці аналіз мерапрыемства. У першую чаргу запытаць у вучняў, якія ўражанні пакінуў фестываль. Што спадабалася, а што не атрымалася. Якая ідэя была ўдачнай, а што можна было зрабіць па-іншаму. Вызначыць, ці дасягнута пастаўленая мэта, ці вырашаны задачы.

## Модуль 4. Прэзентацыя альбома дзелавых папер

Месца правядзення арт-кафэ «Рэха».

**Назва.** Прэзентацыя альбома дзелавых папер.

Назва можа быць іншай. Усё залежаць ад таго, што самі вучні ўкладаюць у паняцце «альбом дзелавых папер».

**Мэта праекта:** правядзенне прэзентацыі альбома дзелавых папер.

**Задачы праекта:**

- прааналізаваць літаратуру па дадзенай тэме і граматна выкарыстоўваць яе;
- ведаць прызначэнне розных відаў дзелавых папер;
- навучыцца самастойна афармляць дзелавыя паперы па адпаведнай форме (у тым ліку па ўзоры);
- навучыцца выкладаць свае думкі дакладна, ясна, коратка.

**Праблемная сітуацыя** (актуальнасць).

XXI стагоддзе характарызуецца як стагоддзе дзелавых узаемаадносін на розных узроўнях.

Дзелавыя паперы займаюць усё большае месца ў жыцці сучаснага чалавека. Узрастае роля правільна аформленых дакументаў у прафесійным вызначэнні, паспяховым працаўладкаванні, паколькі аб пісьменнасці і здольнасцях чалавека судзяць і па напісаных ім дакументах.

Ці паступае чалавек у навучальную ўстанову або на працу, ці атрымлівае пашпарт, ці мяняе яго на новы, ці набывае аўтамабіль, ці віншуе сяброў са святам або пераводзіць грошы, ён звяртаецца да дзелавых папер: складае іх ад рукі або запаўняе адпаведныя бланкі, уносячы туды канкрэтныя звесткі аб сваёй асобе.

Актуальнасць праекта «Прэзентацыя альбома дзелавых папер» у тым, што яго рэалізацыя садзейнічае адаптацыі вучняў да навакольнай рэчаіснасці, задавальненню сацыяльных патрэб асобы.

Развіццё ў вучняў самастойнасці, актыўнасці і творчасці прадугледжвае нараўне з іншымі ўменнямі фарміраванне навыку валодання дзелавой мовай.

**Абсталяванне.**

Мультымедыйны праектар, камп'ютар, мікрафоны, акустычная сістэма.

**Выкарыстанне канчатковага прадукту** (назначэнне).

Альбом дзелавых папер можа быць выкарыстаны ў будучым любым удзельнікам праекта і можа быць размешчаны ў сетцы Інтэрнэт.

**Асаблівасці рэалізацыі.**

Ад мэты, якую ставіць перад сабой ініцыятар дзелавых зносін, залежыць тып дзелавой паперы і выбар моўных формул, клішэ.

**Мэта дзелавой паперы** — правільна і адназначна перадаць інфармацыю. Таму пры складанні афіцыйнай паперы важна ведаць і ўлічваць асаблівасці мовы і стылю сучаснай карэспандэнцыі, а таксама выконваць афарміцельскія патрабаванні. Невыкананне гэтых умоў абцяжарвае працу з дакументамі, пазбаўляе іх юрыдычнай і практычнай значнасці.

Напачатку неабходна нагадаць вучням пра тое, што стыль дзелавых папер афіцыйна-дзелавы. Асноўнымі прыметамі афіцыйна-дзелавога стылю з'яўляюцца канстатацыйна-прадпісальны характар дакументаў, дакладнасць, высокая ступень стандартызацыі, безасабовасць выкладу. Мова афіцыйна-дзелавога стылю мае пэўныя асаблівасці. Гэта шырокае ўжыванне спецыяльнай тэрміналогіі (лексіка справаводства), стандартных сродкаў (так званых «моўных штампаў»), адсутнасць эмацыянальна-экспрэсіўнай

лексікі і інш. У афіцыйных тэкстах часта выкарыстоўваюцца аддзеяслоўныя назоўнікі, адносныя прыметнікі і амаль адсутнічаюць формы 1-й і 2-й асобы займеннікаў і дзеясловаў. Афіцыйна-дзелавому маўленню характэрны складаныя сказы, дзеепрыметнікавыя і дзеепрыслоўныя звароты, канструкцыі са складанымі злучнікамі і адыменнымі прыназоўнікамі.

Арганізаваць працу можна наступным чынам. Спачатку вучні пад кіраўніцтвам настаўніка ўзнаўляюць веды пра мэту і асаблівасці напісання пэўнай дзелавой паперы, аналізуюць узор, звяртаючы ўвагу як на яе змест, моўныя сродкі, так і на знешняе афармленне, затым рэдагуюць адпаведныя дзелавыя паперы, складзеныя не зусім правільна, потым самі ствараюць тэкст гэтага жанру.

Асноўным метадам рэалізацыі праекта з’яўляецца дзелавая гульня.

Дзелавая гульня — гэта комплексны метадычны прыём навучання, пры якім вучні ў першую чаргу разглядаюць працэс прыняцця рашэння.

Метадычная мэта дзелавой гульні заключаецца ў трэніроўцы навыкаў і ў эксперыментаванні з прыняццем рашэнняў і перш за ўсё з іх вынікамі, а таксама ў знаходжанні стратэгій вырашэння праблемы.

Вучням прапаноўваецца наступны сцэнарый: прадпрымальнік збіраецца адкрыць арт-кафэ, у якім плануецца правядзенне прэзентацый мастацкіх твораў, кніг; арганізацыя паэтычных вечароў; буккросінг.

Дадзены сцэнарый прыкладны. Вучні ў 11 класе ўжо вызначыліся (у большасці) з будучым напрамкам дзейнасці, і ім можна прапанаваць скласці свой сцэнарый (бізнес-праект).

Мэтазгодна працу пачынаць са складання спіса папер, неабходных для рэалізацыі канкрэтнага бізнес-праекта. Перад гэтым неабходна прааналізаваць літаратуру па дадзеным напрамку.

Вывучаць дзелавыя паперы са складзенага спіса можна ў любым парадку. Спіс магчыма карэкціраваць у залежнасці ад патрэбы кожнага канкрэтнага бізнес-праекта.

Прапануем пачаць разгляд з дакумента «аб’ява».

Змест аб’яў характарызуецца разнастайнасцю. Месца размяшчэння аб’яў можна ахарактарызаваць наступным чынам: усюды, дзе можна ўбачыць, прачытаць, пачуць. Напрыклад, аб’явы праз газету аб здачы, найме, куплі, продажы, абмене чаго-небудзь. Самымі распаўсюджанымі з’яўляюцца аб’явы аб тых ці іншых мерапрыемствах: аб адкрыцці выставы, правядзенні якога-небудзь вечара, аб занятках секцыі і гурткоў і г. д.

Для адпрацоўкі ўмення правільна складаць дадзеную афіцыйную паперу, неабходна скласці аб’явы для розных крыніц, у якіх будуць размяшчацца паведамленні. Неабходна ўлічыць усе магчымыя варыянты аб’яў: аб’ява аб наборы спецыялістаў, аб’ява аб адкрыцці ўстановы, прадпрыемства і інш., аб’ява аб прэзентацыі праекта і г. д.

Усе прыклады аб’яў увойдуць у альбом дзелавых папер.

**Пісьмы ў дзелавой сферы** (запрашэнне, заказ, прэтэнзія, скарга і іншыя)

У пісьма ёсць дакладнае мэтавае дзеянне. Звяртаючыся да суразмоўцы, вы заўсёды нечага хочаце: пра нешта папрасіць, дамовіцца, даведацца, праінфармаваць. Трымайце фокус увагі на тым, з якой мэтай вы пішаце, пазбягайце абцякальных фармулёвак. Гэта дазволіць зрабіць тэкст простым і зразумелым.

У якасці прывітання выкарыстоўвайце стандартнае «добры дзень», якое не залежыць ад часу сутак або гадзінных паясоў. У дзелавой перапісцы не варта «панібратнічаць», пісаць «добрай раніцы» або «прывітанне».

Заданне на параўнанне правільна і няправільна выкарыстаных фармулёвак дазваляе адначасова выпрацоўваць уменне ўжываць правільна пабудаваныя выразы, а таксама ўменне прадбачыць магчымыя памылкі (табл. 7).

*Табліца 7*

| Няправільна | Правільна |
|---|---|
| Прывітанне, красуня! У мяне ёсць ідэя новага ўлётнага праекта! Гэта Ваня | Марыя, добры дзень! Гэта Іван з кампаніі «Вясёлка». Хачу запрасіць вас стаць экспертам на нашым новым курсе па дызайне |
| Добры дзень, Марыя! Памятаеце, як казаў класік: «Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца»? Мы ў кампаніі да гэтага часу прытрымліваемся гэтага запавету і пацвярджаем — гэта важна! Думаю, мы можам дапамагчы адно аднаму | Добры дзень, Марыя! Хачу абмеркаваць з вамі сумесны запуск адукацыйнага курса. Мы распрацоўваем курс па графічным дызайне і хочам прыцягнуць вашу кампанію ў якасці партнёра |
| Хацеў бы ўдакладніць, пра што б вы хацелі расказаць | Запрашаем вас выступіць на канферэнцыі па маркетынгу і расказаць аб прасоўванні ў сацсетках |

**Аўтабіяграфія.**

Вучням неабходна зазначыць, што аўтабіяграфія з’яўляецца каштоўным матэрыялам для дадатковага вывучэння асобы, яе добрых якасцей і недахопаў, пераваг і антыпатый, асаблівасцей характару. З аўтабіяграфіяй могуць працаваць псіхолагі, графолагі, работнікі службы бяспекі і іншыя спецыялісты. Аўтабіяграфія з’яўляецца дакументам, у якім адлюстраваны асаблівасці асобы, яе жыццёвыя пазіцыі.

Спосаб выкладу аўтабіяграфіі можа быць розным. Самым распаўсюджаным з’яўляецца храналагічны запіс падзей (год за годам), магчыма пачынаць і з тых падзей, якія падаюцца найбольш значнымі і заслугоўваюць увагі. Запіс неабходна весці ў вольнай форме, фіксуючы галоўныя моманты праўдзіва. У тым выпадку, калі напісаная аўтабіяграфія атрымалася вельмі аб’ёмнай і заблытанай, пажадана перапрацаваць матэрыял і скараціць.

Для фарміравання ўмення працаваць з дадзенымі дзелавымі паперамі вучням рэкамендуецца пазнаёміцца з апісаннямі жыцця знакамітых і звычайных людзей і скласці біяграфіі ад іх імя (напрыклад, з біяграфіяй М. Шагала, В.Быкава і інш.).

**Характарыстыка.**

Для ўладкавання на работу ў прыватныя арганізацыі характарыстыку прадстаўляць неабавязкова. Аднак характарыстыка з’яўляецца важным дакументам, у якім указваецца персанальная інфармацыя пра супрацоўніка з апісаннем яго асабістых і дзелавых якасцей.

Неабходна спыніцца на кожнай якасці асобы, абмеркаваць іх значымасць, размеркаваць на станоўчыя і адмоўныя.

Дзелавыя якасці работніка выяўляюцца ў яго здольнасці ўстанаўліваць і наладжваць дзелавыя адносіны з калегамі, кіраўніцтвам, супрацоўнікамі іншых кампаній; у здольнасці ажыццяўляць кіруючыя функцыі ці весці аналітычную працу, займацца планаваннем працы, ажыццяўляць кантроль за выкананнем работ і інш.

Працаздольнасць работніка ацэньваецца па тым, наколькі актыўны ён пры выкананні даручаных абавязкаў, па ўменні арганізоўваць працоўны працэс і выконваць работу

якасна і ва ўстаноўленыя тэрміны, па паводзінах у складаных сітуацыях, па здольнасці браць на сябе адказнасць за вынікі работы, па эфектыўнасці прымаемых рашэнняў або па выніках працы (валодае высокай працаздольнасцю, накіраваны на знаходжанне кампрамісных рашэнняў, да рашэння задач падыходзіць творча).

Асабістыя якасці работніка праяўляюцца ў яго ўзаемаадносінах з калегамі (добразычлівасць, камунікабельнасць, ветлівасць), ва ўзроўні агульнай культуры, яго псіхалагічных якасцях (уважлівы да людзей, тактоўны).

Ацэньваючы якасці работніка, вельмі важна правільна расставіць акцэнты, па магчымасці дакладна вызначыць узровень яго ведаў і навыкаў. У адным выпадку ўзровень ведаў, досведу, навыкаў можна ацаніць як «вельмі добры» ці «высокі» (напрыклад, валодае глыбокімі ведамі), у іншым выпадку як «дастатковы» (напрыклад, мае дастатковы вопыт, мае дастатковыя веды), у трэцім выпадку як «не вельмі дастатковы», «невялікі» (напрыклад, недастаткова добра знаёмы з пытаннямі…, мае недастаткова глыбокія веды…), у чацвёртым выпадку як «адсутнасць ведаў, досведу, навыкаў» і г. д. (напрыклад, не мае досведу ў галіне…, не валодае навыкамі… і інш.).

Складанне станоўчай ці адмоўнай характарыстык дазволіць вучням сфарміраваць уяўленне пра найбольш значымыя асабістыя і дзелавыя якасці для паспяховага працаўладкавання пры падборы супрацоўнікаў.

**Рэзюмэ.**

Рэзюмэ — дакумент, які змяшчае анкетна прадстаўленыя звесткі біяграфічнага характару: інфармацыю аб адукацыі, сферы дзейнасці, прафесійных навыках, асабістых якасцях, творчым патэнцыяле, а таксама ўказанне на канкрэтнае жадаемае месца работы.

Асноўная мэта рэзюмэ — вылучыцца на фоне іншых саіскальнікаў, прыцягнуць увагу працадаўцы і трапіць на размову. Выдзелім тры асноўныя якасці рэзультатыўнага рэзюмэ:

1) сцісласць;
2) індывідуальнасць;
3) акцэнт на выніках і дасягненнях.

Адпрацоўваючы ўменне ствараць рэзюмэ, неабходна навучыцца падкрэсліваць усе станоўчыя моманты і рабіць незаўважным, наколькі гэта магчыма, тое, што моцным бокам не з’яўляецца.

**Распіска.**

Вельмі важна растлумачыць вучням, што дадзены дакумент не вельмі распаўсюджаны ў параўнанні з папярэднімі, але веданне, як правільна напісаць распіску, дапамагае засцерагчы пазыкадаўцу і пры неабходнасці можа служыць доказам у судзе.

Ёсць некаторыя неафіцыйныя рэкамендацыі да напісання пазыковай распіскі. Узор, складзены з улікам гэтых момантаў, дазволіць пазыкадаўцу максімальна засцерагчы сябе ад небяспекі.

Адна з асноўных рэкамендацый заключаецца ў тым, каб распіска была напісана ад рукі пазычальнікам пры пазыкадаўцы. Юрыдычную сілу будзе мець таксама і надрукаваная распіска, з подпісам, але ў выпадку, калі апошні пажадае яе аспрэчыць, прасцей будзе правесці экспертызу почырку. Акрамя таго, лепш за ўсё зверыць подпіс у распісцы і пашпарце.

Для распісак законам устаноўлены 3-гадовы тэрмін даўнасці, лічачы з моманту, калі пазычальнік не вярнуў названы доўг. Па заканчэнні 3 гадоў, пазыкадаўца не зможа вярнуць свае сродкі праз суд.

### Перагаворы.

Перагаворы — камунікацыя паміж бакамі (перагаворшчыкамі) для дасягнення сваіх мэт, пры якой кожны з бакоў мае роўныя магчымасці ў кантролі сітуацыі і прыняцці рашэння, якое замацоўваецца дагаворам.

Самае галоўнае ў перагаворах — гэта не прадмет абмеркаванняў, а тыя метады, якімі вы карыстаецеся. Вядзенне перагавораў — сур'ёзная менеджарская задача, якая складаецца з мноства элементаў, тут важна размяжоўваць пазіцыі і інтарэсы бакоў.

Для адпрацоўкі навыкаў правядзення перагавораў неабходна падрыхтаваць і правесці некалькі сустрэч на розныя тэмы.

### Прэзентацыя альбома дзелавых тэкстаў.

Кожны ўдзельнік праекта, прэзентуючы свой альбом дзелавых папер, абавязкова знаёміць прысутных са сцэнарыем.

Пасля завяршэння прэзентацыі неабходна правесці аналіз мерапрыемства.

## Рэкамендуемая літаратура

*Балтаева, М. Л.* Дзелавая гульня ў навучанні / М. Л. Балтаева. // Малады вучоны. — 2012. — № 2 (37).

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь. Афіцыйны сайт [Электронны рэсурс] — Рэжым доступу : https://mart.gov.by/. — Дата доступу : 01.12.2022.

*Пясняк, І. М.* Крэалізаваныя тэксты ў інтэрнэт-прасторы / І. М. Пясняк ; науч. рук. К. М. Міцкевіч // Язык — Общество — Культура [Электронный ресурс] : сборник материалов международной студенческой научно-практической конференции в рамках 20-й международной научно-технической конференции БНТУ «Наука — образованию, производству и экономике», 28 апреля 2022 г. / Белорусский национальный технический университет, факультет международного сотрудничества ; редкол. : И. В. Будько [и др.] ; сост. Е. Ю. Казимирчик. — Минск : БНТУ, 2022. — С. 161–164.

*Цікоцкі, М. Я.* Стылістыка беларускай мовы / М. Я. Цікоцкі. — Мінск : Універсітэцкае, 1995.

*Янушевский, В. Н.* Методика и организация проектной деятельности в школе. 5–9 классы : метод. пособие для учителей и руководителей школ / В. Н. Янушевский. — М. : ВЛАДОС, 2015.

# Спіс выкарыстанай літаратуры

*Стернин, И. А.* Введение в речевое воздействие / И. А. Стернин. — Воронеж, 2001. — 252 с.

*Караткевіч, В. І.* Да беларускай мовы — праз асэнсаванае чытанне: Развіццё чытацкіх кампетэнцый у школьнікаў і студэнтаў / В. І. Караткевіч, І. І. Караткевіч. // Народная асвета. — 2021. — № 2. — С. 28–31.

*Караткевіч, В. І.* Як заахвоціць школьнікаў да чытання кніг на роднай мове: Чытанне як жыццёвазахавальная функцыя культуры / В. І. Караткевіч, І. І. Караткевіч. // Народная асвета. — 2022. — № 2. — С. 30–33.

*Анисимова, Е. Е.* Лингвистика текста и межкультурная коммуникация (на материале креализованных текстов) / Е. Е. Анисимова. — М. : Изд. центр «Академия», 2003. — 128 с.

*Алексеев, Н. Г.* Проектирование и рефлексивное мышление [Электронный ресурс] / Н. Г. Алексеев // Развитие личности. — 2002. — № 2. — С. 85–103. — Режим доступа : http://rl-online.ru/articles/2-02/111.html. — Дата доступа : 05.02.2022.

*Гузеев, В. В.* Планирование результатов образования и образовательная технология / В. В. Гузеев. — М. : Народное образование, 2001. — 240 с.

Новые педагогические и информационные технологии в системе образования / под ред. Е. С. Полат. — М. : Академия, 2002. — 272 с.

*Пахомова, Н. Ю.* Метод проектов в образовательном учреждении / Н. Ю. Пахомова. — М. : АРКТИ, 2003. — 112 с.